
Падтрымай "Вясну" на PATREON

Кропкавыя затрыманні ў 35-ую гадавіну трагедыі на Чарнобыльскай АЭС

дапоўнена

26.04.2021 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў, затрыманні



Затрыманне ў Мінску. Скрыншот з відэа

Праваабарончы цэнтр "Вясна" працягвае збіраць факты палітычнага пераследу. Сёння - ў гадавіну трагедыі на Чарнобыльскай АЭС - улады забаранілі праводзіць традыцыйнае шэсце і мітынг. Каля 16.30 у цэнтр Мінска пачалі сцягваць спецтэхніку - вадамёты, аўтазакі, аўтобусы з сілавікамі.

Калі вас ці вашых блізкіх затрымалі, паведамляйце нам праз тэлеграм-бот @viasna_bot ці на гарачую лінію:

- **+375 44 734 45 51**
- **+375 29 835 94 49**
- Тэлеграм **@ViasnaSOS, @SOSViasna**

Ад 17 гадзін 26 красавіка у Мінску міліцыянеры пачалі спыняць людзей, правяраць іх заплечнікі і тэлефоны, таксама ГАІ спынялі аўтамабілі. Пачаліся і кропкавыя затрыманні.

Сярод затрыманых:

- **Аляксеева Яўгенія** (адпусцілі, дзяўчына з Мендзялеева, у якой сёння дзень нарадэння)
- **Барышнікава Дар'я**
- **Іваноў Данііл** (дома правялі ператрус)
- **Карпей Іван** (забралі з дома)
- **Кірцун Кацярына**
- **Косцік Ян**
- **Крукоўскі Аляксей** (затрыманы каля дома)
- **Літвінава Наталля** (папярэдне забралі з дома)
- **Порхун Максім**
- **Рымша Уладзімір**
- **Хляба Аліна**
- **Эльяшэвіч Ілона** (адпусцілі, затрыманая на віншаванні сяброўкі з днём нараджэння)

Каля 10 чалавек было затрымана ў двары па вул. Мендзялеева, куды маладзёны прыйшлі павіншаваць сваю сяброўку з Днём нараджэння і сканчэннем каранціну ў сувязі з каранавірусам. Хлопцы і дзяўчаты былі апранутыя ў спецыяльныя медыцынскія касцюмы і трымалі плакаты. У хуткім часе ў двор прыехалі супрацоўнікі міліцыі ў цывільным, які спачатку акружылі людзей, праверылі дакументы, а потым усіх затрымалі. Сярод затрыманых і сама імянінніца.

Дапоўнена: блогер **Антон Матолька** ў сваім тэлеграм-канале паведамляе, што затрыманых на віншаванні адпусцілі з РУУС.



У мінскі офіс беларускай партыі “Зялёныя” ламіліся невядомыя. Пра гэта Еўрарадыё паведаміў старшыня партыі **Дзмітрый Кучук**.

Ён адзін знаходзіцца ў офісе і не можа выйсці, бо ў пад'ездзе і на вуліцы дзяжураць “ціхары”.

> *"Да нас у офіс ламіліся ў дзверы, але не адкрылі. Зараз адрубілі інтэрнэт і электрычнасць. Сілавікі стаяць у пад'ездзе, некаторыя пад дажджом на вуліцы. У офісе я адзін. Атрымліваецца, выйсці не магу... Калі выйду — складана сказаць, пакуль яшчэ няма рашэння. Хацеў бы, вядома, трапіць на памятныя мерапрыемствы, якія планаваліся, ускласці кветкі",* — распавёў Кучук.


Сузаснавальніку KYKY, палітвязню **Аляксандру Васілевічу** працягнулі тэрмін утрымання пад вартай яшчэ на два месяцы. Пра гэта распавяла яго жонка **Надзея Зелянкова** на сваёй старонцы ў Фэйсбуку.


Вядомага юрыста **Аляксандра Жука** сёння на 10:00 выклікалі на допыт у Следчы камітэт у якасці сведкі па "справе Прэс-клуба Беларусь"

Інфармацыя будзе дапаўняцца


Твитнуть


#FREEVIASNA


Вясна. Правы чалавека ў …
9 922 "Нравится"
ВЯСНА
Нравится
Свяжитесь с нами


СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ
"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ
Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы
Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных
Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул
WWW.GAZETABY.CO


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі


"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"





Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Без зменаў. Адбылася апеляцыя па справе "Вясны"

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

"Суды згубілі сваю функцыю, а грамадзянская супольнасць перанесла знішчальную атаку". Павел Сапелка — на канферэнцыі АБСЕ

Праваабарончая праграма "Вясна" на Беларускім Радыё Рацыя

Грамадзяніна Польшчы асудзілі ў Беларусі за "агентурную дзейнасць"

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Заява аб прызнанні палітвязнямі Аляксея Камароўскага, Іллі Шакірава і Барыса Протасава

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ


МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

Anti-Discrimination Centre
memorial

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY